УДК 821.161.3.09

# БЕЛАРУСКАЯ КРЫТЫКА І ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА 70–80-х гг.

Клімуць Я. І. (Установа адукацыі "Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова", кафедра тэарэтычнай і прыкладной лінгвістыкі)

Анатацыя. У артыкулс разглядаецца стан беларускай крытыкі і літаратуразнаўства другой паловы XX ст.

Літаратурны працэс у той час істотна залежаў ад стану дзяржаўнай палітыкі, ідэалагічных патрабаванняў. У сярэдзіне 60-х адбылася ў пэўнай меры змена ўнутрыдзяржаўнага курса, аднак у літаратурным жыцці прадаўжаліся ранейшыя тэндэнцыі, хоць ціск на пісьменніцкую арганізацыю ідэалагічных структур узмацняўся. І была адпаведная рэакцыя крытыкаў і літаратуразнаўцаў, якія ў бягучым працэсе больш увагі ўдзялялі эстэтычным праблемам, што асабліва выяўлялася ў рускай перыёдыцы, у чым кіруючая і напраўляючая сіла ўбачыла спробу выйсці з-пад яе кантролю. Відаць, гэта таксама пасадзейнічала з'яўленню пастановы ЦК КПСС "Аб літаратурна-мастацкай крытыцы" (1972), пасля якой былі прынятыя і адпаведныя рашэнні ў рэспубліках. У адпаведнасці з імі пачалі праводзіцца шматлікія нарады на розным узроўні – ад рэдактараў усіх відаў выданняў да семінараў для маладых і пачынаючых крытыкаў і літаратуразнаўцаў. Пры ўсіх гэтых адміністрацыйных захадах па падпарадкаванні творчых сіл былі і вызначальна станоўчыя вынікі. Акрамя спецыяльных літаратурных выданняў рэспубліканскія і абласныя газеты яшчэ больш увагі надалі выступленням крытыкаў. Станоўчы рэзананс быў і ў тым, што аднавіліся і пашырыліся такія крытычныя жанры, як агляд літаратуры за год па жанрах, адкрыты ліст, эсэ, літаратуразнаўчыя дыялогі, літаратуразнаўчае інтэрв'ю,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

розныя віды анкетавання і інш. Тады ж ставілася пытанне пра выданне ў Беларусі літаратурна-крытычнага часопіса тыпу вядомага маскоўскага выдання "Вопросы литературы", аднак задума так па нейкіх прычынах і не была здзейснена. А станоўчы вынік усяго быў яшчэ і ў тым, што ва ўсіх выданнях павысіліся патрабаванні да публікацый, усё менш праходзіла ў друк прыкметна хвалебных рэцэнзій, прызнанняў вартасці твора толькі за важную ўзнятую тэму. І яшчэ была адна асаблівасць таго часу, відаць, ў тым, што пачалі выдавацца штогадовыя выпускі зборнікаў выбраных крытычных твораў усіх жанраў. Праўда, з сярэдзіны сямідзясятых гадоў зноў усё істотна змянілася, хоць знешне быццам бы ніякага ўціску не было, але раптам сталі непатрэбнымі вышэйшыя вынікі крытыкі, паколькі неяк ціха зніклі гэтыя гадовікі, не ўспаміналася ўжо і пра магчымасць выдання крытычна-літаратуразнаўчага часопіса. Але ўсё ж у гэты перыяд крытыка яшчэ была баявітай, пра што сведчыла шмат публікацый у часопісах і газетах. У кожным нумары літаратурных часопісаў друкаваліся праблемныя артыкулы па гісторыі літаратуры і бягучым літаратурным працэсе, рэцэнзіі на новыя творы, тое ж назіралася на старонках рэспубліканкіх і абласных газет. Праўда, кідалася ў вочы і другая асаблівасць, у нечым таксама вызначальная: сярод публікацый у той час зараз бачыцца многае быццам знарочытае, выклікане не столькі патрэбай выказацца пра многія дужа набалелыя праблемы, колькі засведчыць правільнасць курсу крытычнай і літаратуразнаўчай думкі. І ўсё ж актуальна прагучаў артыкул М. Грынчыка "Рэгіянальныя асаблівасці літаратуры", у якім аўтар "местачковасць" выступлення таленавітых майстроў слова (В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Тапчэўскага, А. Абуховіча і інш.) паказаў як веліч творчасці выбітных асоб праз сувязь іх з народам і вуснай паэтычнай творчасцю. Гэта характэрна і для артыкула пра развіццё жанраў беларускай літаратуры ў мінулым Я. Усікава "Класічны вадэвіль", у якім разгледжаныя важнейшыя жанравыя рысы "Пінскай шляхты" В. Дуніна-Марцінкевіча, іншых артыкулах пра сучасны літаратурны працэс.

Паказальным у гэтым плане з'яўляецца артыкул С. Андраюка "Чытаючы маладую прозу", па сутнасці, агляд першых кніг празаікаў, выдадзеных у канцы шасцідзясятых гадоў. Крытык найбольш увагі ўдзяляе творчасці А. Кудраўца (Зб. "На зялёнай дарозе"), у якой убачыў галоўныя тэндэнцыі на той час маладой прозы: уменне перадаваць "*жыццё ў яго фізічна рэальнай натуральнасці*" [1, с. 164]. Заўважыў ён і некаторыя небяспечныя тэндэнцыі: "*Сённяшняя проза маладых паказвае чалавека ў сувязях і ўзаемаадносінах самых бліжэйшых, непасрэдных. Перад глыбокімі супярэчнасцямі часу яна стаіць у нерашучасці. Яна найбольш цікавіцца побытам людзей, асабістымі ўзаемадносінамі, індывідуальнымі пошукамі сэнсу жыцця. Для маладых – і гэта добра відаць у некаторых апавяданнях А. Пінчука, А. Кандрусевіча, В. Дайліды, І. Шальманава – тоіцца тут вялікая небяспека драбнатэм'я і павярхоўнасці*" [1, с. 167]. На жаль, прагнозы у многім спраўдзіліся. У артыкуле В. Каваленкі "У далечы жыццёвых гарызонтаў: Агляд прозы за 1972 год" (Полымя, 1973, № 6) адчуваўся сапраўдны клопат пра літаратуру, трывога, што паніжаўся парог патрабавальнасці ў пісьменнікаў, хоць адначасова ён і падкрэсліваў, што літаратура не складаецца толькі з геніяльных твораў. Ён адзначыў пралікі аповесці С. Кухарава "Бацькавічы" ў тым, што ў ёй вельмі яскрава праявіўся журналісцкі вопыт нарысіста, і новыя рубяжы беларускай прозы засведчылі аповесці В. Быкава "Дажыць да світання" і А. Адамовіча "Хатынская аповесць", майстэрства паказу жыцця ў апавяданнях Я. Брыля, А. Кудраўца, Г. Далідовіча. Даволі актыўна выступалі ў перыядычным друку і рэгіянальныя творчыя сілы. У прыватнасці, друкавалі рэцэнзіі прадстаўнікі Магілёўшчыны С. Гаўрусёў і М. Стральцоў, змястоўныя рэцэнзіі апублікаваў А. Пысін, у часопісе "Полымя" друкавалі даследаванні А. Адамовіч, Дз. Бугаёў, М. Мушынскі, В. Жураўлёў і інш. На мяжы 70–80-х гадоў стаў актыўна выступаць на старонках перыё-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

дыкі выпускнік Магілёўскага педінстытута М. Кенька і выкладчык кафедры беларускай літаратуры В. Атрашкевіч. Асабліва многа друкавацца артыкулаў і рэцэнзій стала на старонках абласной газеты “Магілёўская праўда”, у другой палове 80-х. Там вялася рубрыка “Анталогія літаратурнай Магілёўшчыны”, у якой грамадскасці прадстаўляліся невядомыя, а таксама напаўзабытыя імёны творцаў.

Першы вялікі грамадскі форум Рэспубліканская навукова-тэарэтычная канферэнцыя “Асаблівасці развіцця літаратурнага працэсу ў Беларусі на сучасным этапе” адбыўся ў Магілёве 17–18 кастрычніка 1978 года. У канферэнцыі прынялі ўдзел навукоўцы Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР, выкладчыкі гуманітарных навук ВНУ і інастаўнікі сярэдніх школаў. На шматлікіх секцыях разглядаліся не менш актуальныя праблемы як гісторыі літаратуры, так і пытанні тэорыі, сучаснага літаратурнага працэсу і выкладання літаратуры ў ВНУ і школе. У прыватнасці, М.М. Грынчык засяродзіў увагу на стане беларускага вершазнаўства і акрэсліў яго задачы на будучае, зазначыўшы, што “*комлекснае вывучэнне беларускай метрыкі будзе садзенічаць далейшаму плённаму даследаванню тыпалагічных і кантактных міжлітаратурных сувязей у галіне вершатворчасці*” [2, с. 91]. В. Атрашкевіч акцэнтаваў увагу на традыцыях аўтабіяграфічных твораў 20-х гадоў у сучаснай беларускай прозе, асабліва ў празаікаў першага пасляваеннага дзесягоддзя, якое паспяхова выкарыстоўвала “*адкрытыя іх папярэднікамі метады і прыёмы*” выяўлення ўсяго перажытага на вайне. І ў наступнага пакалення даследчык убачыў тыя ж спосабы “*трансфармацыі асабістасных рэалій у мастацкія каціны і вобразы. Аб гэтым сведчаць творы І. Пташнікава, Б. Сачанкі, М. Стральцова, У. Паўлава, В. Казько і многіх іншых майстроў беларускага мастацкага слова*” [2, с. 5–6].

Вяршыняй літаратуразнаўства таго часу з’яўляецца выхад двухтомнага выдання “Гісторыі беларускай літаратуры” на рускай мове, якая, па сутнасці, прадставіла беларускую літаратуру на еўрапейскай арэне. І ўрэшце рэалізавалася ідэя напісання падручнікаў для вышэйшай школы, калі выйшлі дзве кнігі “Гісторыі беларускай савецкай літаратуры” як дапаможнік для студэнтаў універсітэтаў і столькі ж як падручнік для студэнтаў філалагічных факультэтаў педінстытутаў, удзел у падрыхтоўцы якіх прынялі Дз. Бугаёў, М. Мушынскі, М. Луфераў.

## Літаратура


1. Андраюк, С. Вывяраючы жыццём / С. Андраюк – Мінск : Маст. літ., 1976 – 287 с.
2. Асаблівасці развіцця літаратурнага працэсу ў Беларусі на сучасным этапе: матэрыялы Рэспубліканскай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі / Рэд.калегія М. М. Грынчык, П. К. Дзюбайла (адказны рэдактар), Я. К. Усікаў) – Мінск : МДПІ імя А. М. Горкага, 1979. – 225 с.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова